■ ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ




Прадстаўніца нашага політэхнічнага каледжа Паліна Гутырчык разам са сваімі педагогамі Рэгінай Скакоўскай і Наталляй Варпаховіч.

# Імідж прафесіі ў міжнародным фармаце

У трэці раз прайшоў рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства «WorldSkills Belarus 2018», які доўжыўся два дні. Ён з'яднаў больш за 300 навучэнцаў, студэнтаў, маладых рабочых да 22 гадоў з усіх рэгіёнаў краіны. Былі госці з Расіі і Казахстана. Пераможцы рэспубліканскага этапу паедуць на сусветнае першынство ў наступным годзе ў Казань. Сярод канкурсантаў былі і прадстаўнікі Маладзечанскага політэхнічнага каледжа.

экспертам па Беларусі. транспарту і лагістыкі, інфар-



**За работай удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «WorldSkills Belarus 2018» уважліва назіраюць эксперты.**

Іх падапечная Паліна вучыцца на трэцім курсе. Для яе гэта першы маштабны конкурс. Нягледзячы на сур'ёзную канкурэнцыю, дзяўчына адчувала сябе ўпэўнена. Шматлікія «рэпетыцыі» конкурсных заданняў, пра якія ўдзельнікі ведалі загадзя, не прайшлі дарэмна.

«Самае складанае на конкурсе, калі на цябе глядзіць столькі людзей», – усміхаецца Паліна. Сваю будучую прафесію яна лічыць не інакш як творчай. З дзяцінства любіла маляваць, гэтаму яе навучыла бабуля па мамінай лініі (дарэчы, сама мама – мастачка, займаецца роспісам па дрэве). Але дзяўчына ў якасці матэрыялу для ажыццяўлення ўласных творчых ідэй выбрала цеста. Асабліва ёй падабаецца пячы тарты. Пасля заканчэння каледжа Паліна марыць працаваць поварам у рэстаране.

... Яшчэ двое навучэнцаў політэхнічнага каледжа Арцём Голас і Аляксей Кудзерка (у тандэме з Уладзіславам Скамацыі і камунікацыі, сацыяльных і персанальных паслуг, творчых прафесіях і модзе. Сярод новых і «Візуальны мерчандайзінг», «Касметалогія», «Аграномія». Таксама на форуме была прэзентаваная секцыя «Дыфскілз» — гэта першы ў свеце чэмпіянат прафмайстэрства сярод людзей з парушэннямі слыху. У рамках мерапрыемства адбыўся таксама конкурс па асновах прафпадрыхтоўкі сярод школьнікаў.

Саарганізатарамі і партнёрамі «WorldSkills Belarus 2018» з'яўляюцца Міністэрствы адукацыі і прамысловасці нашай краіны, а таксама айчынныя і замежныя вытворцы і пастаўшчыкі абсталявання, матэрыялаў, інструментарыю, беларускія прадстаўніцтвы буйных сусветна вядомых вытворчых кампаній.

**P.S.** Калі вярстаўся нумар, стала вядома, што Паліна Гутырчык адзначана бронзавым медалём.

**Ірына РАБУШКА.**
**Фота: Вячаслаў ТАБУЛІН.**

---

**МГ**

# Імідж прафесіі ў міжнародным фармаце

*Пачатак на 1-й стар.*

Гэта ўстанова адукацыі таксама стала адной з конкурсных пляцовак па кампетэнцыі «Хлебапячэнне», якая сёлета ўведзена ўпершыню. Тут сапраўды разгарнулася гарачая барацьба, у чым мы пераканаліся на свае вочы. У рэсурсным цэнтры нашага політэхнічнага ўдзельнікі павінны былі паказаць абсалютна ўсе этапы выпечкі (ад замесу цеста) хлеба, хлебабулачных (плецёных) вырабаў і дробнай здобы з начынкай і без яе. Для гэтага маштабнага вытворчага працэсу ў каледжы ёсць неабходнае абсталяванне.

**ДА ВЕДАМА**

**WorldSkills – вядомыя ва ўсім свеце найбуйнейшыя спаборніцтвы па прафесійным майстэрстве. Ім ужо больш за 60 гадоў. Праводзяцца раз у два гады ў міжнародным фармаце. Галоўная мэта – прыцягненне ўвагі да рабочых прафесій, павышэнне статуса прафесіянальнай адукацыі і стандартаў прафпадрыхтоўкі і кваліфікацыі.**

Акрамя нашай Паліны Гутырчык, у ліку канкурсантак былі прадстаўніцы сталічнага, гомельскага, магілёўскага і віцебскага рэгіёнаў. Паліне дапамагалі падрыхтавацца выкладчыкі спецдысцыплін Наталля Варпаховіч і Рэгіна Скакоўская. Яны таксама ўвайшлі ў лік суддзяў разам з педагогамі іншых аналагічных устаноў адукацыі, але судзіць «сваіх» ніхто з іх не меў права. Наталля Аляксандраўна была кіраўніком-экспертам ад Мінскай вобласці, Рэгіна Адамаўна – галоўным экспертам па Беларусі.

рабагатавым з Барысава) выступілі адпаведна ў кампетэнцыях «Электрамантаж» і «Мехатроніка». Спаборніцтвы па названых кірунках праводзіліся на футбольным манежы ў Мінску. Дарэчы, на гэтай конкурснай пляцоўцы акумуляваліся падзеі ў фармаце анлайн-трансляцыі і з іншых, у тым ліку з Маладзечна.

Наогул, спаборніцтвы праводзіліся па 37 прафесіях – па тэхналогіі інжынерыі, вытворчасці і будаўніцтва, у галінах транспарту і лагістыкі, інфар-